Created in Master PDF Editor - Demo Version

**Беларускі гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 29. Мн., 2014. С.326-332.**

# Прыклад інавацый у беларускай гістарычнай навуцы

Менавіта такую задачу паставіў перад сабой аўтарскі калектыў новага шасцітомнага выдання “Гісторыя Беларусі” пад кіраўніцтвам акадэміка М.П. Касцюка. У склад аўтарскага калектыва ўваходзяць як супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, так і выкладчыкі шэрагу ВНУ рэспублікі.

Роўна праз чвэрць стагоддзя пасля выхаду 5-га тома “Гісторыя Беларускай ССР” у 2000 годзе ў выдавецтве “Экаперспектыва” пабачыў свет першы том новага шматтомнага выдання.

Неабходнасць падрыхтоўкі гэтага выдання была абумоўлена шэрагам прычын. Галоўная з іх у тым, што з абвяшчэннем незалежнай, суверэннай Рэспублікі Беларусь патрэбна было грунтоўнае пераасэнсаванне шматвяковага гістарычнага мінулага беларускага народа.

Першы крок у гэтым накірунку быў зроблены з выданнем “Нарысаў гісторыі Беларусі” ў дзвюх частках, якія пабачылі свет у 1994 – 1995 гг.

Многія чытачы могуць задаць пытанне:

“Чым жа істотна адрозніваецца “Гісторыя Беларусі” (выдання 2000 – 2011 гг.) ад пяцітомнай “Гісторыі Беларускай ССР”, якая была надрукавана ў 1972 – 1975 гг? Што ў ёй прынцыпова новага?”

Па-першае, гэта адрозненні канцэптуальнага характару. У пяцітомніку гісторыя беларускага народа асвятлялася з метадалагічных пазіцый марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Шасцітомнік напісаны ў цэлым па прынцыпу “Платон мне сябра, але ісціна даражэй”.

Па-другое, значна пашырылася база крыніц – архіўных, музейных, зборнікаў дакументаў, мемуараў, кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, перыядычнага друку.

Па-трэцяе, у параўнанні з пяцітомнікам, у якім адсутнічае асобны разгляд гістарыяграфіі і крыніц, то ў кожным томе шасцітомніка маецца грунтоўны гістарыяграфічны і крыніцазнаўчы агляд.

Па-чацвертае, толькі ў першым томе папярэдняга выдання выкарыстана літаратура на польскай мове. У рэцэнзуемым выданні аўтары спасылаюцца на публікацыі, як на польскай, так і на літоўскай, украінскай, нямецкай і англійскіх мовах.

Акрамя таго, у пачатку 1990-х гг. даследчыкі атрымалі магчымасць больш шырока карыстацца тымі архіўнымі фондамі, якія раней былі засакрэчаны і не выдаваліся вучоным. Перш за ўсе. мы маем на увазе фонды Цэнтральнага архіва Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і некаторых маскоўскіх архіваў, асабліва Дзяржаўнага архіва Расійскай Фелэрацыі.

Па-пятае, толькі першыя два тамы ранейшага выдання былі прысвечаны падзеям гісторыі Беларусі ад старажытнасці да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года. Што датычыцца шасцітомніка, то адзначаны вышэй перыяд асвятляецца ў чатырох тамах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Па-шостае, аўтарамі дадзенага выдання ўзняты шэраг праблем, якія аб'ектыўна і суб'ектыўна не маглі быць даследаваны да абвяшчэння незалежнай Рэспублікі Беларусь.

А цяпер паспрабуем праанілізаваць тэкст шасцітомніка па асобных тамах.

У першым томе (рэдактары М.Чарняўскі і Г.Штыхаў) разглядаецца мінулае нашай Бацькаўшчыны ў першабытны і раннесярэднявечны перыяды (каля 100 тысяч гадоў назад- першая палова XIII ст.) – ад першапачатковага засялення да фарміравання і развіцця першых дзяржаўных утварэнняў. Яго асаблівасцю з'яўляецца тое, што ен напісаны ў асноўным на падставе асэнсавання шматлікіх археалагіяных матэрыялаў, здабытых пры раскопках.

Больш грунтоўна і ўсебакова даследуецца першабытная эпоха і гісторыя беларускіх зямель у раннім сярэднявеччы. Несумненнай вартасцю першага тома з'явіўся зварот яго аўтараў да існуючых на дадзены момант канцэпцыяў паходжання беларускага этнасу: "балцкага субстрату" і "старажытнарускай" народнасці.

Вельмі важна, што ў гэтай кнізе раскрываецца працэс асваення тэрыторыі Беларусі ў ледавіковую эпоху і эвалюцыю яе насельнікаў ў наступныя эпохі – сярэдні і новы каменны, а затым у бронзавы і жалезны вякі. Нельга не згадзіцца з аўтарамі тома, калі яны акцэнтуць увагу на ўзаемадзеянне чалавека і прыроды, развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры тагачасных супольнасцей, гаспадарчых заняткаў – ад прысвойваючых да вытворчых,. прадстаўленых найперш земляробствам, жывелагадоўляй, шахтавай крэмнездабычай, а таксама сацыяльным узаемаодачыненням, спробам этнічных вызначэнняў носьбітаў асобных археалагічных культур.

Вартасцю першага тома, безумоўна, з'яўляецца тое. што ўся гісторыя першабытнага грамадства на сучасных беларускіх землях паўстае як шматгранны і складаны працэс, абумоўлены ў значнай ступені знаходжаннем Беларусі ў цэнтры Еўропы.

Упершыню падрэсліваецца важная роля хрысціянства ў культурным жыцці беларускага грамадства перыяду ранняга сярэднявечча

У адрозненне ад папярэдняга выдання асобая ўвага надаецца ўзнікненню першых дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях.

У аўтараў кнігі былі ўсе падставы характарызаваць грамадства ранняга сярэднявечча як шматукладнае, дзе існавалі тры эканамічныя ўклады - пешабытнаабшчынны,. рабаўладальніцкі (на ўзроўні хатняга рабства і феадальны.

Значную цікавасць уяўляе глава 3 "Эканамічныя ўклады, грамадскі лад, гаспадарка ў IX – XIII стст". У параўнанні з першым томам пяцітомнага выдання тут уздымаецца пытанне пра шматукладны характар гаспадаркі на беларускіх землях у разглядаемы перыяд.

Нягледзячы на шматлікія вартасці, рэцэнзуемае выданне, на вялікі жаль, не пазбаўлена шэрагу недахопаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Ва ўступе да першага тома пры характарыстыцы абагульняючых прац па гісторыі Беларусі першай чвэрці XX ст. разглядаюцца працы Вацлава Ластоўскага “Кароткая гісторыя Беларусі” (1910 г.), Усевалада Ігнатоўскага “Кароткі нарыс гісторыі Беларусі” (1919 – 1926 гг.), Мітрафана Доўнар-Запольскага “Гісторыя Беларусі”. Разам з тым, на вялікі жаль замоўчваецца гістарычная спадчына аднаго з заснавальнікаў беларускай гістарычнай навукі Уладзіміра Пічэты. Мы маем на ўвазе цыкл лекцый па гісторыі беларускага народа, апублікаваны ў кнізе: “Курс белорусоведения. Лекции, читанные в Белорусском народном университете в Москве летом 1918 года” (М., 1918 – 1920), а таксама абагульняючую працу “Гісторыя Беларусі. Ч.1” (М. – Л., 1924).

Акрамя таго, па-за ўвагай засталіся шэраг абагульняючых прац, апублікаваных у 30-я – 40-я гг. XX ст.: Васіля Шчарбакова “Нарыс гісторыі Беларусі. Ч.1.” (Менск, 1934); “Нарысы па гісторыі Беларусі. Ч.1” (Мінск, 1940); “История БССР. Вып.1 (Минск, 1946); «Тезисы об основных вопросах истории БССР. (Материалы для преподавателей, лекторов и докладчиков). Ч.1. История белорусского народа до Великой Октябрьской социалистической революции (Минск, 1948).

Дзіўным чынам “згубілася” заключэнне да першага тома рэцэнзуемага выдання.

Гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага – з моманту яго заснавання і да Люблінскай уніі – прысвечаны асобны, другі том “Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага” (рэдактары Ю.Бохан і Г.Галенчанка).

Вельмі важнымі з’яўляюцца думкі, што беларускія землі ў многіх адносінах вызначалі сутнасць, накіраванасць, характар гэтай магутнай еўрапейскай дзяржавы, што Беларусь і ў пэўнай ступені іншыя ўсходнеславянскія землі былі тэрытарыяльнай, дэмаграфічнай, гаспадарчай, ваеннай, фінансавай,. духоўнай асновай Вялікага Княства Літоўскага, вялікакняскага домена. Менавіта тут закладваліся падмуркі самых вялікіх магнацкіх і царкоўных латыфундый, існавалі буйныя гарады. На гэтыя землі прыйшоўся асноўны цяжар доўгай і драматычнай для ўсіх бакоў цяжбы ВКЛ з Вялікім Княствам Маскоўскім у XY-XYI стагоддзях ва Усходняй Еўропе.

Асабліва каштоўнымі трэба лічыць высновы, што ў перыяд Вялікага Княства Літоўскага продкі сучасных беларусаў пачалі асэнсоўваць сябе цэласным, непарыўным народам са сваей гістарычнай спадчынай, культурай, светапоглядам, звычаямі, гаспадарскім і жыццевым побытам, што менавіта іх здзяйсненні нямала садзейнічалі стварэнню разам з літоўцамі і некаторымі іншымі народамі новай шматэтнічнай дзяржавы на балцка-славянскіх абшарах.

Аўтары падкрэсліваюць, што ВКЛ “з самага пачатку свайго існавання ....насіла поліэтнічны характар”, а “пры палітычным дамініраванні дынастыі балцкага (літоўскага) паходжання ў ВКЛназіралася культурная і эканамічная перавага славянскіх рэгіёнаў”.



Created in Master PDF Editor - Demo Version

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Прынцыпова новым з’яўляецца разгляд этнакультурных працэсаў і развіцця царкоўна-рэлігійных адносін у рэчышчы агульна-еўрапейскіх працэсаў. Пры разглядзе гісторыі гарадоў і мястэчак Беларусі ў XV – XVI стст. асобая ўвага надаецца ўсебаковаму асвятленню урбанізацыйных працэсаў.

Нельга не згадзіцца з думкай аўтараў другога тома, што вялікае Княства Літоўскае адыгрывала адметную ролю ў палітычным і цывілізацыйным развіцці Ўсходняй Еўропы не толькі сваімі памерамі і грамадска-палітычным ладам, але таму, што яно стала першым збіральнікам раздробленых зямель Заходняй Русі, паказала рэальную магчымасць такіх шырокіх дзяржаўных і шматэтнічных утварэнняў, моцна стымулявала развіцце цэнтраімклівых працэсаў сярод “буферных” прамежкавых княстваў (такіх., кк Цвярское, Чарнігаўскае, Смаленскае і іншыя), а таксама на землях Паўночна-Усходняй Русі).

Заслугоўвае ўвагі думка, што ў Вялікім Княстве Літоўскім упершыню ва Усходняй Еўропе ў XY-XYI стагоддзях сфарміраваўся своеасаблівы дзяржаўна-палітычны лад еўрапейскага тыпу, іншы, чым у Паўночна-Заходняй Русі ў часы панавання самадзержцаў, адпаведная сацыяльная структура грамадства. Так, менавіта тут, на беларускіх і лі тоўскіх землях раней іь шырэй, чым у Вялікім Княстве Маскоўскім і ўкраінскіх землях праявіліся павевы еўрапейскага Рэнесансу, узнікла кірылічнае кнігадрукаванне, распаўсюдзіліся універсітэцкая адукацыя. шматмоўная літаратура і пісьменнасць, рэфармацыйныя рухі ў еўрапейскім абліччы. У Беларусі і Літве знаходзілі прытулак беглыя ерэтыкі. вальнадумцы з усходу і захаду Еўропы, развіваліся розныя царкоўныя структуры, умацоўваліся інстытуты саслоўнай (станавай) дэмакратыі.

Чытачам будзе вельмі цікава прачытаць наступныя радкі: “Уводзін” да другога тома:

“Кніга падрыхтавана значным аўтарскім калектывам, што накладае на рэдакцыю тома адказнасць за максімальную захаванасць аўтарскіх падыходаў, хоць з некаторымі высновамі рэдакцыя не згодна” (стар.7).

У той жа час, аналізуючы этнакультурныя працэсы ў ВКЛ у XVI стст., аўтары другога тома не ўпамінаюць такія значныя даследаванні У. Пічэты па дадзенай праблеме, як “Образование белорусского народа” (у часопісе “Вопросы истории”, 1946, №5-6) і “Культура Белоруссии XVI в.” (у кнізе “Белоруссия и Литва XV – XVI вв”.М. 1961)

Пры асвятленні працэсу запрыгоньвання сялянства аўтар параграфа М.Ф.Спірыдонаў дае шмат спасылак на ўласныя публікацыі.

Трэці том шасцітомніка “Беларусь у часы Рэчы Паспалітай” (XYII-XYIII стст.) (рэдактары Ю.Бохан, П.Лойка) разглядае мінулае нашай Бацькаўшчыны ў перыяд знаходжання беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай. У ім адлюстраваны важнейшыя пытанні ўнутранага і знешнепалітычнага жыцця дзржавы “двух народаў”, якія тычыліся беларускіх зямель, асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Нельга не згадзіцца з думкай рэдактараў тома:

“Гэты этап быў адным з самых складаных у гісторыі нашай Бацькаўшчыны. Шматлікія войны. якія спусташальнай віхурай праносіліся па тэрыторыі Беларусі, прывялі да зруйнавання беларускіх гарадоў і весак, надоўга спынілі пастунальнае развіцце эканомікі. Сталі прычынай зацяжных крызісаў, якія ўдалося перадолець толькі ў канцы дадзенага перыяду. У выніку знішчэння насельніцтва гарадоў адбылося змяненне іх этнічнага аблічча за кошт змяншэння мяшчан-беларусаў. Гэты працэс разам з апалячваннем вышэйшага, пануючага саслоўя – шляхты – прывеў у т ой час да паступовага пераўтварэння беларусаў у сялянскую нацыю, а таксама да аслаблення ўплыву беларускіх фактараў на фарміраванне “высокай культуры”.

У трэцім томе гісторыя Беларусі часоў Рэчы Паспалітай правамерна падзяляецца на тры перыяды. Першы перыяд – з пачатку да сярэдзіны XYII стагоддзя, другі перыяд – сярэдзіна XYII – першая палова XYIII стагоддзя, трэці перыяд – другая палова XYIII стагоддзя.

Адзначаючы. што ў сярэдзіне XYII стагоддзя беларускія землі былі ўцягнуты ў сферу казацка-сялянскай вайны, якая перакінулася з украінскіх зямель і з’явілася вынікам узрастання сацыяльных,. нацыянальных і рэлігійных супярэчнасцей у Рэчы Паспалітай, аўтары тома справядліва лічаць, што гэта вайна стала паваротным пунктам у гісторыі беларускіх зямель.

У пяцітомніку вайна 1654 – 1667 гг. мае назву “руска-польская” і характарызуецца як “барацьба беларускага народа за ўз’яднанне з Расіяй” . У трэцім томе “Гісторыі Беларусі” абсалютна іншы канцэптуальны падыход да падзей гэтай вайны, якая названа “вайной Расіі з Рэччу Паспалітай”. Аўтары закранаюць пытанне “акупацыйнай палітыкі царскіх улад” і “народнага супраціўлення” акупантам на беларускіх землях.

Адзначаючы трагічныя вынікі вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654-1667 гадоў і Паўночнай вайны 1704-1717 гадоў, калі тэрыторыя Беларусі з’яўлялася асноўнай арэнай баявых дзеянняў, аўтарскі калектыў тома аргуменціруе гэта катастрафічным скарачэннем колькасці жыхароў беларускіх гарадоў і весак, разбурэннем эканомікі ш выніку знішчэння насельніцтва, яго захопа у палон, голада і эпідэмій. Акцэнтуецца ўвага чытачоў, што пагаршэнне становішча беларускага сялянства параджала сацыяльны пратэст, які выяўляўся ў розных формах, нават ва ўзброенай барацьбе.

Аналізуючы перадумовы рэформы А.Тызенгауза, аўтары тома слушна заўважаюць:

“У гэтых складаных умовах дзяржаўная ўлада і феадалы шукалі найбольш спрыяльныя шляхі па пераадоленню глыбокага эканамічнага крызісу, у тым ліку праз павышэнне зацікаўленасці сялянства і мяшчанства ў выніках сваей працы, паслабленне падатковага ўціску, пошуку найбольш аптымальных спосабаў гаспадарання і інш. Значнай з’явай у гэтым напрамку стала рэфрма Антонія Тызенгауза ў каралеўскіх эканоміях”. .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

У першым томе пяцітомніка літаральна адным сказам згадваецца паўстанне 1794 года пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, а ў рэцэнзуемым выданні дадзенай важнай гістарычнай падзеі прысвечаны асобны параграф (с.245 – 259), дзе разглядаюцца падрыхтоўка, пачатак узброенай барацьбы, асаблівасці паўстання ў Беларусі і Літве, выкарыстанне партызанскай тактыкі ў змаганні супраць расійскіх войск і прычыны паражэння. Разам з тым, і ў трэцім томе шасцітомніка пры асвятленні паўстання 1794 г. па-за ўвагай аўтараў застаўся сюжэт пра ўдзел беларускіх яўрэяў і татар у гэтым паўстанні.

У адрозненне ад пяцітомніка, дзе працэсы канца XVIII ст. трактуюцца як "ўз'яднанне Беларусі з Расіяй", ў новым выданні выкарыстоўваюцца тэрміны "уключэнне зямель … Беларусі ў склад Расійскай імперыі" і "адыход да Расіі …. зямель Беларусі".

Пры характарыстыцы матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага народа ў XVII – XVIII стст. значнае месца адводзіцца аналізу рэлігійна-канфесійнага жыцця, у тым ліку і нехрысціянскіх канфесій. Але пры гэтым у гістарыяграфіі да трэцяга тома падкрэсліваецца, што " пытаннямі, звязанымі з гісторыяй мусульманства на беларускіх землях у складзе Рэчы Паспалітай, займаюцца С.Думін і І. Канапацкі (с.18). Больш дакладна было б напісаць не "мусульманства", а "ісламa".

У трэцім томе зроблена прынцыпова важная выснова, што падзелы Рэчы Паспалітай з'явіліся лагічным завяршэннем глыбокага палітычнага крызісу,. у якім знаходзілася гэта дзяржава з сярэдзіны XYIII стагоддзя. Перадумовы гэтага крызісу былі закладзены яшчэ раней і выявіліся ў паступовым аслабленні ўлады манархаў. Безумоўна, найбольш яскрава гэта праявілася ў існаванні права "liberum veto", якое фактычна паралізавала заканадаўчую дзейнасць у Рэчы Паспалітай.

На аснове аналізу шматлікіх крыніц аўтары прыйшлі да заключэння, што для беларускіх зямель перыяд XYII- XYIII быў звязаны таксама з імкненнем пануючых класаў да апалячвання насельніцтва беларускіх зямель. Пасля пастановы ўсеагульнай канфедэрацыі саслоўяў Рэчы Паспалітай 1696 года аб забароне пісаць дзяржаўныя дакументы на беларускай мове для беларускага этнасу пачаўся асабліва цяжкі шлях змагання за тое, каб захваць дасягнутыя раней пазіцыі не толькі ў эканамічым развіцці, але і набытую спадчыну ў галіне культуры. ва ўсей духоўнай сферы.

Знаходжанню беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі прысвечаны чацвёрты том рэцэнзуемага выдання (рэдактары В.Яноўская і С.Рудовіч)

Ва ўступе да яго справядліва адзначаецца, што ў пачатку XIX ст. "Беларусь аказалася месцам гістарычнай сустрэчы і ўзаемадзеяння еўрапеізаваных норм жыцця з тымі сацыяльна-палітычнымі і культурнымі стандартамі, што панавалі ў еўрапейска-азіяцкай імперыі Раманавых. З гэтага часу асноўнай тэндэнцыяй стала паступовая пераарыентацыя Беларусі з заходняга на ўсходні вектар развіцця".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Першы раздзел чацвертага тома раскрывае саслоўную, нацыянальную і канфесіянальную палітыку царызму на новадалучаных землях з канца XYIII ст. да сярэдзіны XIX ст.

Нельга не згадзіцца з высновай аўтарскага калектыву, што далучэннек беларускіх земляў да Расійскай імперыі дало імпульс развіццю гуманітарных навук, што абумоўленае палітычнымі і эканамічнымі інтарэсамі расійскіх улад, распачалося компл екснае даследаванне гісторыі, мовы, матэрыяльнай і духоўнай культуры беларускага этнасу. Адным з аргументаў для дадзенай всновы з'яўляецца канстатацыя таго факту, што ўжо з канца XYIII ст. з'явіліся першыя навуковыя публікацыі пра Беларусь..

Другі раздзел (1860-1890-я гг.) змяшчае матэрыял аб зрухах у развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі на аснове ўкаранення капіталістычных адносін пасля рэформы 1861 г. Вельмі важна, што у ім знайшоў адлюстраванне працэс сацыяльна-класавай трансфармацыі, пачатак фарміравання грамадскай супольнасці на беларускіх землях.

Заслугоўвае ўвагі выснова аўтараў, што сацыяльная мадэрнізацыя грамадства на рубяжы XIX – XX стст. прывяла да абвастрэння палітычнай барацьбы. з'яўлення шматлікіх палітычных партый, арганізацый, агульнага ўздыму грамадскага руху. На самой справе, ў сацыяльных умовах беларускай рэчаіснасці эканамічныя пытанні былі цесна звязаны з нацыянальнымі праблемамі. Асноўныя накірункі палітычнага крызісу расійскага самадзяржаўя вызначалі так званае "польскае пытанне", а трошкі пазней яўрэйскае і беларускае пытанні.

Аўтары адмаўляюцца ад назвы "айчынная вайна" пры характарыстыцы ваенных падзей 1812 года на Беларусі.

Фактычна новым сюжэтам з'явіўся разгляд этнічнага складу насельніцтва і этна-дэмаграфічных працэсаў на беларусіх землях у канцы XIX ст. – пачатку XX ст.

У цэнтры трэцяга раздзелу правамерна знаходзіцца даследаванне суадносін паміж рэфармісцкімі і рэвалюцыйнымі шляхамі пераўтварэння беьларускага грамадства ў 1901-лютым 1917 г. У параўнанні з пяцітомнікам тут больш падрабязна аналізуюцца новыя з'явы ў эканоміцы, хістанні і супярэчнасці палітыкі царызму на беларускіх землях напярэдадні краху царызму. Больш выразна і аб'ектыўна паказаны ўзнікненне і дзейнасць розных палітычных партый і арганізацый.

Даецца аб'ектыўная ацэнка сутнасці сіянізму і дзейнасці бундаўскіх арганізацый на беларускіх землях.

Прынцыпова важным, што ўвага чытачоў акцэнтуецца на гісторыі беларускага нацыяльна-палітычнага і культурна-асветніцкага руху., на барацьбе за аднаўленне беларускай дзяржаўнасці, высвятленне асаблівасцей нацытворчых працэсаў.

Па-новаму раскрыты масавая эміграцыя з Беларусі ў XIX– пачатку XX ст. і пачатак фарміравання беларускай дыяспары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Адзначаючы наватарскі падыход аўтарскага калектыва да асвятлення многіх пытанняў гісторыі гэтага перыяду, трэба заўважыць, што пры гістарыяграфічным аналізе становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі ў пераліку работ, прысвечаных нацыянальным меншасцям не ўпамінаюцца кнігі А. Субоціна “В черте еврейской оседлости”. (Вып. 1 – 2. СПб. 1888 – 1890), А. Скіра “Еврейская духовная культура в Беларуси” (Минск, 1995), Э. Іофе “Страницы истории евреев Беларуси” (1996), В. Сабалеўскай “Спрадвечныя іншаземцы: старонкі гісторыі гарадзенскіх яўрэяў” (Гародня, 2000), В. Сабалеўскай і У. Ганчарова «Евреи Гродненщины: жизнь до Катастрофы» (Донецк, 2005), “Ю. Функ “Евреи Беларуси в конце XIX – начале XX века” (Минск, 1998), Я. Анішчанкі “Евреи Белорусской губернии: Ист. очерк и док.” (Минск, 2002), кандыдацкія дысертацыя І. Герасімавай “Яўрэйская адукацыя ў Беларусі ў XIX – пачатку XX стст. і адносіны да яе расійскага самадзяржаўя” і В.Тамашэвіч “Зараджэнне і развіцце сіянізму ў паўночна-заходніх губернiях Расійскай імперыі (1880-1907)”

Адсутнічае шэраг прац У. Пічэты, прысвечаным сялянскаму руху, класавым супярэчнасцям напярэдадні рэвалюцыі 1905 г. і дзейнасці палітычных партый.

Разглядаючы канфесіянальную і нацыянальную палітыку царскага ўрада ў беларуска-літоўскіх губернях на працягу 1772 – 1825 гг., аўтар А.Філатава адзначае, што гэтая палітыка “не была выразна акрэслена”. А далей канстатуецца, што “нязменнай заставалася яе сутнасць: замацаванне Расіі на навадалучаных землях, усталяванне пануючай ролі праваслаўя на гэтай тэрыторыі, падпарадкаванне ўсіх катэгорый мясцовага насельніцтва ўладзе Расійскіх імператараў” (с.75).

Пры аналізе гісторыі гарадоў і мястэчак ў канцы XVIII – першай паловы XIX ст. не выкарыстана кандыдацкая дысертацыя І. Соркінай, прысвечаная гэтай праблеме.

Пры разглядзе пытання аб аграрных рэформах другой паловы XIX ст. няма спасылак на манаграфію М. Фрыдман “Адмена прыгоннага права ў Беларусі” (Мінск, 1958). (с.157 – 158).

Павярхоўна паказаны падзеі 18 кастрычніка 1905 г. ў Беларусі, вядомыя як “Курлаўскі растрэл”. (с.322)

Пры асвятленні гісторыі Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны па-за ўвагай аўтара засталіся пытанні аб яўрэйскіх пагромах на Заходнім фронце ў 1915 г. (с.443)

У пятым томе(рэдактар М.Касцюк) чытач мае магчымасць пазнаёміцца з шэрагам новых тэм і сюжэтаў. Так, праводзіцца грунтоўнае пераасэнсаванне характару і сутнасці падзей, якія адбываліся на беларускіх землях на працягу лістапада 1917 – студзеня 1918 гг.

Значную цікавасць уяўляюць сюжэты пра Беларускую Народную Рэспубліку і Слуцкае паўстанне 1920 года, пра ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі. У дадзеным томе , праводзіцца ўсебаковы яе разгляд у асобным раздзеле: “Беларусізацыя як галоўнае звяно дзяржаўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

нацыянальнай палітыкі” (с.216 – 225). Аўтары лічаць беларусізацыю “краевугольным каменем нацыянальнага адраджэння” (С.217)

Не выклікае пярэчанняў выснова аўтараў, што “праводзімая ў сярэдзіне 20-х гг. палітыка беларусізацыі.......мела часовы, кан’юнктурны характар” (с.568 -569).

Асобны параграф прысвечаны падзеям, звязаным з заключэннем Рыжскага мірнага дагавора. Вельмі добра, што надрукаваны загад камандуючага войскамі Заходняга фронта М. Тухачэўскага, выдадзены 12 жніўня 1920 г. пра стварэнне Часовага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта С.С.Р.Б. у складзе старшыні – А. Р.Чарвякова і членаў: Кнорына, Адамовіча, Вайнштэйна і Ігнатоўскага (с.77).

Са старонак пятага тома чытач зможа даведацца, што яшчэ да стварэння СССР Беларуская ССР атрымала дыпламатычнае прызнанне з боку Германіі. Так, 5 лістапада 1922 г. “рэйхсканцлер Германіі А. Вірт заявіў паўнамоцнаму прадстаўніку РСФСР і БССР у Германіі М. Красцінскаму пры падпісанні Берлінскага дагавора, што Германія прызнае БССР і ўстанаўлівае з ёй дыпламатычныя і консульскія адносіны да ратыфікацыі дагавора”. (с.208)

Значную цікавасць ўяўляе новы сюжэт пра дзейнасць Амерыканскай адміністрацыі дапамогі (АРА) – якая ў 1920 – 1923 гг. ажыццяўляла харчовую дапамогу насельніцтву Беларусі.

Аўтарамі пятага тома грунтоўна пераасэнсоўваюцца працэсы грамадска-палітычнага і нацыянальна-культурнага жыцця Беларускай ССР у 1920-я –1930-я гады: усталяванне аднапартыйнасці і яе ролю ў фарміраванні сталінскай таталітарнайі сістэмы, барацьба з “нацыянал-дэмакратызмам”, драматычны і трагічны шлях калектывізацыі, змаганне савецкай улады з практыкай стварэння сялянскіх саюзаў.. Спецыяльная глава прысвечана нарастанню праяваў таталітарызму ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Найбольшую цікавасць для чытачоў уяўляе параграф, у якім асвятляюцца масавыя рэпрэсіі.

Прынцыпова важнымі з’яўляюцца высновы пра тое, што у БССР гэтыя працэсы адбываліся асабліва востра, аб чым сведчаць матэрыялы даследавання, праведзенага аўтарскім калекьывам.

Каштоўнай з’яляецца думка, што моцны адбітак на грамадска-палітычнае жыццё рэспублікі ў міжваенны перыяд накладвала яе прыгранічнае становішча. “Яно з’яўлялася прычынай для апраўдання многіх рэзкіх ацэнак і дзеянняў не толькі адносна асобных працаўнікоў, але нават сацыяльных пластоў насельніцтва” (с.569).

Знайшлося месца для асэнсавання такога фактара нацыянальна-культурнага развіцця БССР, як рэлігійны. Менавіта супраць рэлігіі, як сведчаць аўтары, у 20 – 30-я гг. XX ст. дзяржаўна-партыйныя органы праводзілі мэтанакіраваную барацьбу. (сс. 249 – 260, 328 -335).

Шмат новага пра жыццё беларусаў знойдзе для сябе чытач у раздзеле, прысвечаным гісторыі Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы. Гэта разгорнуты аналіз сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

дадзенага рэгіёна, змагання беларусаў за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне, духоўнага жыцця насельніцтва ва ўмовах паланізацыі.

Пры асвятленні падзей перыяду Другой сусветнай вайны вялікі інтарэс у чытача змогуць выклікаць сюжэты пра арышты і дэпартацыі насельніцтва Заходняй Беларусі ў канцы 1939 г. – першай палове 1941 г., пра калабарацыянізм і беларускую дыяспару.

Да нядаўняга часу лічылася што першы партызанскі атрад на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны быў створаны ў Пінскім раене 28 чэрвеня 1941 года пад кіраўніцтвам В.З.Каржа.

Новым словам у даследаванні гісторыі партызанскага руху з'яўляецца пададзены ў кнізе факт, што “ужо на другі дзень вайны на тэрыторыі Жабінкаўскага раёна каля в. Старое Сяло быў створаны партызанскі атрад, які атрымаў назву “Старасельскі”. Кіраваў атрадам маёр В. Дародных”. (с.492).

Адной з вартасцей пятага тома з'яўляецца падрабязная храналогія важнейшых падзей, якія адбываліся на працягу адносна невялікага перыяду – 28 гадоў.

Нягледзечы на відавочныя вартасці гэтага тома, неабходна выказаць пэўныя заўвагі і пажаданні.

Так, у гістарыяграфіі пятага тома адзначаецца, што “адметную ролю ў вывучэнні першых гадоў савецкай улады ў Беларусі адыгралі даследчыкі Інстытута беларускай культуры, які дзейнічаў у 1922 – 1929 гг” (с.9). Але ж вядома, што ў кастрычніку 1928 г. былі праведзены выбары акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў у Беларускую акадэмію навук, якая афіцыйна пачала сваю дзейнасць 1 студзеня 1929 года (гл. сс.236, 588).

Навукова-папулярнае выданне З. Шыбекі “Нарыс гісторыі Беларусі. (1795 – 2002) (Мінск, 2003) кваліфікуецца як манаграфія. Слова “Беларусі” у назве кнігі надрукавана з малой літары. (с.23)

На с. 63 прыведзена фота “Групы камандзіраў Заходняга фронту”, сярод якіх пазначаны П. Дыбенка і І. Якір. Але ні П. Дыбенка, ні І. Якір не ваявалі ў гады грамадзянскай вайны на Заходнім фронце.

Нічога не сказана пра візіты ў Мінск 13 – 17 ліпеня 1919 г. члена Рэвваенсавета Заходняга фронту І.Сталіна і Старшыні Рэвваенсавета Рэспублікі Л. Троцкага – у маі і верасні 1920 г.

Вельмі фрагментарна разглядаецца дзейнасць Амерыканскага яўрэйскага аб'яднанага размеркавальнага камітэта – Джойнта на тэрыторыі Беларусі ў пачатку 1920-х гг. (с.210 – 211)

На с.231 не датуецца фота “Прафесарска-выкладчыцкага склада БДУ”, якое было зроблена ў 1922 г.

Вельмі мала ўвагі, на наш погляд, адводзіцца аўтарамі даследаванню стварэння і дзейнасці Інстытута беларускай культуры. Акрамя таго, да сённяшняга часу, спрэчным застаецца пытанне пра дакладную дату заснавання гэтай установы. Акрамя згаданай даты 30 студзеня 1922 г., у гістарычнай літаратуры сустракаюцца даты 1 і 20 лютага 1922 г. На думку рэцэнзентаў, датай заснавання Інбелкульту трэба лічыць 20 лютага 1922 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Дзіўна і незразумела, чаму не ўзгадваюцца прозвішчы партыйных і дзяржаўных дзеячаў Беларусі – ахвяр палітычных рэпрэсій – З. Жылуновіча, А. Чарвякова, М. Галадзеда, Зм. Прышчэпава, Д. Валковіча, А. Кавалёва.

На наш погляд, недастаткова асветлены прычыны паражэння Чырвонай Арміі ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, а таксама эвакуацыя насельніцтва. Лічба ў 1,5 мільёна эвакуіраваных фактычна завышана амаль у 2 разы.

Не знайшло дастатковага адлюстравання пытанне пра кіраўніцтва партызанскім рухам у пачатковы перыяд вайны – з чэрвеня 1941 г. – да сакавіка 1942 г. У гэты час важную ролю ў арганізацыі і кіраўніцтве партызанскім рухам адыгралі органы НКДБ і НКУС, Ваенныя саветы шэрагу франтоў і армій.

На 488 с. гутарка ідзе толькі пра "больш за 160 гета", існаваўшых на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай айчыннай вайны. На самой справе, у межах БССР на 22 чэрвеня 1941 года іх колькасць складала каля 270. Зыходзячы з гэтага прыведзеная аўтарамі колькасць "лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў – 260" на тэрыторыі рэспублікі, не адпавядае рэчаіснасці, і замест гэтай лічбы павінна стаяць лічба 270. .

Не прыводзіцца ў кнізе дакладная і поўная назва каардынуючага органа партызанскага руху ў Беларусі, які дзейнічаў з 20 сакавіка 1942 г. Дакладная назва гэтага органа – Паўночна-Заходняя група ЦК КПБ і СНК БССР (с. 505.)

На с.525 адзначаецца, што ў Беларусі ў гады вайны "дзейнічалі ўзброеныя адзінкі АК і АУН – УПА і іх падтрымлівалі пэўныя групы насельніцтва". Але акрамя іх дзейнічалі беларускія партызанскія групы, якія не падпарадкоўваліся ЦШПД і БШПД. Паводле ацэнак некаторых даследчыкаў колькасць партызан у гэтых групах і атрадах вагалася ў межах ад 3 да 5 тысяч чалавек. (О.В. Романько. Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941 – 1945. М., 2008)

Прыводзяцца толькі паасобныя лічбы калабарацыяністаў у некаторых населеных пунктах Беларусі. На жаль, аўтарамі не прыводзіцца канкрэтная колькасць беларускіх, літоўскіх, латышскіх, украінскіх, рускіх і іншых калабарацыяністаў у Беларусі.

Магчыма аўтарам дадзенага выдання не вядома, што Р. Сямёнава-Фрыдзон была другім камандзірам жаночага партызанскага атрада ў Францыі (с.560 – 561).

Шосты том "Гісторыі Беларусі" (рэдактар У.Навіцкі) ахоплівае перыяд 1946 – 2009 гг. У ім раскрываецца гісторыя беларускага народа ад пераможнага завяршэння Вялікай Айчыннай вайны да канца існавання СССР, паказаны асаблівасці развіцця Беларусі ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту, перыяду парламенцкага кіравання і прэзідэнцкай рэспублікі. Вельмі важна, што ў гэтым томе знайшлі адлюстраванне сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя працэсы, дзейнасць вышэйшых і мясцовых эшалонаў улады ў нашай рэспубліцы і стваральная праца беларускага народа з другой паловы 1940-х гадоў па першае дзесяцігоддзе XXI ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Калі апошні том папярэдняга пяцітомнага выдання заканчваўся асвятленнем падзей 1974 года, то ў новым выданні храналагічныя рамкі даследавання пашыраюцца на 35 гадоў.

У раздзеле першым разглядаецца барацьба з антысавецкім падполлем 1944 – 1955 гг. Асобная глава прысвечана дэмаграфічным і этнасацыяльным працэсам.

У главе пятай канцэптуальна новымі з'яўляюцца раскрыццё сутнасці пасляваеннай ідэалогіі сталінізму, працэсаў дэнацыяналізацыі асветы і навукі, супярэчлівага характару канфесійнай палітыкі.

Прынцыпова важна, што рэдактар тома У.Навіцкі і яго аўтары не ўхіліся ад асвятлення вельмі "вострых" пытанняў культурнай палітыкі, якую праводзіла ў 1947- 1950 гг. тагачаснае кіраўніцтва БССР на чале з першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі М.І.Гусаравым. Яны разглядаюцца ў параграфах "Барацьба з "пакланеннем і нізкапаклонствам" перад Захадам" і "Антысеміцкая кампанія".

У гэтых параграфах справядліва адзначаецца, што першыя пасляваенныя гады характарызаваліся разгортваннем у краіне, у тым ліку ў Беларусі, антысеміцкай кампаніі, наступленнем на яўрэйскую культуру, што было звязана з ростам нацыянальнай свядомасці савецкіх яўрэяў у сувязі з працэсам станаўлення яўрэйскага дзяржаўнага ўтварэння.

Пасля з'яўлення перадавога артыкула газеты "Праўда" артыкула "Аб адной антыпатрыятычнай групе тэатральных крытыкаў" у БССР разгарнулася кампанія выкрыцця касмапалітаў, крытыкі адзінага ў рэспубліцы Беларускага дзяржаўнага тэатра, якая закончылася пастановай 30 сакавіка 1949 г. аб расфарміраванні яго творчага калектыва.

У аўтараў былі ўсе падставы для наступнай высновы:

"Такім чынам, пасляваенныя гады вызначаліся правядзеннем шэрага кампаній, скіраваных на падтрымку сталінізму. Атмасфера страху, пошуку "ворагаў" была вызначальнай у грамадстве, што спаўна адчула на сябе як беларуская, так і яўрэйская інтэлігенцыя, увесь народ" (с.155-156)...

Нельга не згадзіцца з думкамі аўтараў, што з сярэдзіны 1950-х гг. для белшарускага народа адкрышся новы гістарычны этап, што закрыты характар савецкага, у тым ліку беларускага, грамадства садзейнічаў яго адрыву ад еўрапейскай і сусветнай супольнасці. Кансе5рвацыі існаваўшых форм жыцця.

На самой справе, сапраўднае ўсведамленне ацэнкі пражытых дзесяцігоддзяў, якое паступова прыйшло пасля XX з'езда КПСС, было звязана з пэўным пераасэнсаваннем ролі вярхоўнага кіраўніцтва краіны ў грамадскім развіцці і не закранала асновы савецкага ладу жыцця - аднапартыйную сістэму, высокую ступень цэнтралізацыі ў кіраванні сацыяльна-эканамічнымі, грамадска-палітычнымі і культурнымі працэсамі, абмежаваннямі ў развіцці ўсяго нацыянальнага.

У раздзеле другім звернута ўвага на непаслядоўнасць і незавершанасць новых падыходаў да ўдасканалення гаспадарчага комплексу. Значнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

навізной адрозніваецца глава чацвёртая дадзенага раздзелу “Колькасныя і этнасацыяльныя змяненні ў складзе насельніцтва”.

Трэці раздзел утрымлівае шэраг новых сюжэтаў, прысвечаных палітычнаму стану грамадства, у тым і ліку такой з’яве, як дысідэнства; дэмаграфічным і этнасацыяльным зменам на працягу 1971 – 1991 гг.; адукацыйна-культурнай сферы; рэлігійнаму жыццю і міжнародным стасункам.

Асаблівую цікавасць чытачоў выкліча глава “Беларускае грамадства ў часы перабудовы”, у якой знайшлі адлюстраванне пытанні “эканамічнага вектару мадэрнізацыі гаспадарчага механізму”, “пачатак рэфармавання палітычнай сістэмы і працэсы дэмакратызацыі”, “катастрофа на Чарнобыльскай АЭС…

Аналізуючы палітычнае развіцце Беларусі ў канцы 1980-х-першай палове 1990-х гг., аўтары прыйшлі да важнай высновы, што радыкальныя змены ў палітычных абставінах стварылі спрыяльныя ўмовы для новага этапу нацыянальнага адраджэння. Яны аргументуюць гэтую выснову тым, што пашыралася ўжыванне беларускай мовы, якая заняла больш трывалыя пазіцыі ў сферы адукацыі. навуковай дзейнасці, сродках масавай інфармацыі. Былі рэабілітаваны многія нацыянальныя беларускія дзеячы, якія сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій у часы сталінскага праўлення, а ў гуманітарных навуках, літаратуры, розных іншых відах мастацтва была пераадолена ідэалагічная зададзенасць.

Упершыню у калектыўным шматтомным выданні разглядаецца гістарычны шлях Беларусі на працягу 1991 – 2009 гг. ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту. У главе другой чацвёртага раздзела выключную цікавасць уяўляюць параграфы, прысвечаныя спробам укаранення інавацыйных тэхналогій у прамысловасць, раскрыццю ролі культуры ў захаванні нацыянальнай самабытнасці беларускага народа, а таксама становішчу Беларусі ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.

На аснове глыбокога і дэтальнага вывучэння разнастайных крыніц аўтары тома прыйшлі да аргументаванай высновы, што апошнія амаль два дзесяцігоддзі навейшай гісторыі нашай рэспублікі па свайму зместу даволі выразна распадаюцца на два этапы – да сярэдзіны 1994 г., ва ўмовах парламенцкага кіравання, і пасля гэтага часу (сярэдзіна 1994-2009 гг) - устанаўлення прэзідэнцкага праўлення. Калі на першым этапе ў абставінах крызісных з’яў адбываліся радыкальныя пераўтварэнні ў грамадска-палітычнай, сацыяльна-эканамічнай сферы, у галіне нацыянальнага развіцця, то на другім – назіралася ўсе больш настойлівае імкненне да пераадолення негатыўных працэсаў у эканоміцы, паступовыя зрухі на гэтым шляху, фарміраванне беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Разам з тым, хацелася б выказаць некаторыя пажаданні.

Выкарыстоўваючы ўспаміны і публікацыі дзяржаўна-партыйных кіраўнікоў Беларусі М.Патолічава, К. Мазурава, П.Машэрава і В.Кебіча,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

аўтарам дадзенага тома неабходна было б звярнуцца і да апублікаваных ўспамінаў П.Панамарэнкі, М. Дземянцея.

Пры разглядзе выхаду БССР на міжнародную арэну ў пасляваенны перыяд у шостым томе не былі ўведзены ў навуковы зварот мемуары шматгадовага міністра замежных спраў БССР К. Кісялёва “Записки советского дипломата” (М., 1974)

Разглядаючы выкарыстанне адміністрацыйнага рэсурса у кіраўніцтве сельскай гаспадаркай БССР, аўтары спасылаюцца на пастанову ЦК УКП(б) ад 10 мая 1950 г. “Аб недахопах у кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі сельскай гаспадаркай”(с.81). Неабходна адзначыць, што прычынай прыняцця дадзенай пастановы з’явілася сакрэтнае пісьмо міністра дзяржаўнай бяспекі БССР Л. Цанавы міністру дзяржаўнай бяспекі СССР В. Абакумаву, з якім той пазнаеміў І.Сталіна Вынікам разгляду гэтага пісьма і пастановы ЦК УКП(б) стала адхіленне ад пасады кіраўніка кампартыі Беларусі М.Гусарава.

У чацвёртай главе “Дэмаграфічныя і этнасацыяльныя працэсы”, на вялікі жаль, не прыведзена ніводнай спасылкі на архіўныя матэрыялы. Хутчэй за ўсё гэтым абумоўлена адсутнасць канкрэтных лічбаў страт насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (с.118).

На той жа старонцы гутарка ідзе пра смерць класіка беларускай літаратуры Змітрака Бядулі 3 лістапада 1941 года “ўдалечыні ад радзімы”. Было б лагічна, каб аўтары тома ўзнялі пытанне пра перанос праху класіка беларкскай літаратуры з Уральска ў Мінск.

Выклікае сумненне меркаванне аўтараў, пра тое, што пасля Вялікай Айчыннай вайны адбывалася “масавае перасяленне” у Мінск “яўрэяў што ў перадваенны час жылі ў розных гарадах і мястэчках Беларусі” (с.136).

Шэраг пытанняў выклікае сцвярджэнне, што “па-ранейшаму на карэнных жыхароў падала прыкладна 4/5 … агульнай колькасці насельніцтва рэспублікі. Астатнюю частку складалі галоўным чынам палякі, рускія, украінцы, яўрэі, татары, літоўцы і латышы” (с.136).

Па-першае, не толькі беларусаў, але і так званую “астатнюю частку” насельніцтва рэспублікі можна лічыць карэннымі жыхарамі, так як некалькі пакаленняў прадстаўнікоў адзначаных вышэй этнічных меншасцяў спрадвеку жылі на беларускай зямлі.

Па-другое, незразумела да якога года адносіцца адзначаны вышэй паказчык колькасці карэнных жыхароў: 1945, 1950 ці 1959?

На с.153 не зусім дакладна прыведзена дата ўтварэння Дзяржавы Ізраіль. Дзяржава Ізраіль была заснаваная не 5 мая, а 14 мая 1948 года.

У параграфах, прысвечаных рэлігійнаму жыццю ў БССР у 50-я – 80-я гады, разглядаецца становішча толькі хрысціянскіх канфесій. (гл. сс. 344 – 357, 504 – 521)

Аўтары фактычна ўхіляюцца ад ацэнкі гістарычнага значэння Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР 27 ліпеня 1990 г.

Шкада, што ў якасці навуковых кансультантаў для асобных тамоў шасцітомніка не былі прыцягнуты высокакаваліфікаваныя спецыялісты з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

многіх ВНУ і іншых устаноў рэспублікі, не гаворачы ўжо нават аб некаторых навуковых супрацоўніках Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

Гаворка ідзе аб вядомых беларускім вучоных-археолагах Э.Загарульскім, П.Лысенка, І.Марзалюке, Я.Рыеры, членах-карэспандэнтах НАН Беларусі У.Бабкове і М.Піліпенка, вучоных-гісторыках Я.Анішчанке, І.Басюке, Ш.Бекцінееве, П.Брыгадзіне, У.Коршуке, Г.Бушчык, М.Бяспалай, А.Вішнеўскім, В.Галубовічу, А.Грыцкевічу, Э.Дубянецкім, А.Лютым, А.Жытко, М.Забаўскім, Э.Савіцкім, У.Ладысеве, М.Забаўскім, П.Зялінскім, Дм.Караве, М.Кузняцове, С.Новікаве, Н.Палетаевай, І.Палуяне, С.Рассадзіне, А.Русецкім, С.Сельвестравай, М.Сяменчыке, В.Скалабане, М.Сташкевічу, М.Сакалове, І.Соркінай, Н.Стужынскай. У.Тугае, А.Трусаве, П.Чыгрынаве, А.Шаркове, І.Шаўчуку. В.Шведзе, вучоным-палітолаге С.Кізіме, супрацоўніках Інстытута гісторыі НАН Беларусі - высокакваліфікаваных антраполагах,. дактарах навук Л.Тэгака і І.Салівон.

Пажадана каб аўтараў, якіх ўжо няма ў жывых, пазначаць у адпаведным афармленні. Так, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Іван Ягоравіч Марчанка памёр 19 красавіка 1997 г., доктар гістарычных навук, прафесар Міхаіл Восіпавіч Біч памёр 17 мая 1999 г., акадэмік НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка – 3 лютага 2002 года, пазначаны ў ліку жывых аўтараў.

Нягледзячы на адзначаныя недахопы, дадзенае выданне з'яўляецца значным крокам у даследаванні гісторыі Беларусі з глыбокай старажытнасці да нашых дзён. Несумненнай заслугай аўтарскага калектыву з'яўляецца глыбокае навуковае асэнсаванне малавядомых і невядомых старонак шматвяковай гісторыі беларускага народа.

Пераважная большасць высноў аўтарскіх калектываў усіх шасці тамоў вызначаецца дастатковай аргументаванасцю.

Асабліва гэта датычыцца наступных заключных высноў:

"Вялікае Княства Літоўскае было прыкладам талерантных адносін паміж праваслаўнымі і каталікамі, прадстаўнікамі іншых канфесій...

Эканамічнае, сацыяльна-палітычнае, культурнае развіцце, рэлігійныя адносіны на беларускіх тэрыторыях мацавалі ваенную магутнасць ВКЛ...

Найбольш трагічнай для яго (беларускага народа – Э.І., В.М.) стала 13-гадовая вайна паміж імі (Рэччу Паспалітай і Маскоўскай дзяржавай – Э.І., В.М.), што адбылася ў 1654-1657 гг., калі на землях Беларусі загінула больш за палову насельніцтва. Гэта найбольш цяжкія страты за ўсю нашу шматвекавую гісторыю...

Геапалітычнае становішча Беларусі, яе находжанне паміж заходнім і усходнім суседзямі (Рэччу Паспалітай і Расійскай імперыяй - Э.І., В.М.) прывяло да таго. што беларускі народ на некалькі стагоддзяў страціў сваю дзяржаўнасць. Гэта негатыўным чынам адбілася на яго захаванні, у першую чаргу выжыванні карэннага, тытульнага этнасу...

Самаадданае змаганне беларускага народа з нямецка-фашысцкімі захопнікам таксама стала працягам яго гераічнага мінулага. Але такая з'ява



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Created in Master PDF Editor - Demo Version

Created in Master PDF Editor - Demo Version

як калабарацыянізм, сведчыла аб складанасці развіцця і неадназначных адносінах часткі насельніцтва Беларусі да палітыкі і практычнай дзейнасці савецкай улады.

Больш чым 30-гадовае сталінскае праўленне ў гісторыі беларускага народа – складаная і неадназначная грамадска-палітычная з’ява. Дасягненні тут былі відавочныя, але адбываліся яны надзвычай вялікім коштам і сумяшчаліся з цяжкімі выпрабаваннямі...

Бясспрэчна, што асноўная падзея гісторыі Беларусі канца XX ст. звязана з аднаўленнем беларускай дзяржаўнасці, якая адсутнічала на працягу некалькіх стагоддзяў, у час знаходжання беларускіх зямель у складзе першай Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі.

...Аднак ва ўмовах самастойнага існавання патрабавалася стварыць новыя напрамкі жыццядзейнасці – выпрацаваць сваю ўнутраную і знешнюю палітыку, напоўніць яе зместам, адпавядаючым нцыянальным інтарэсам, аднавіць эканоміку, сацыяльную галіну і інш.”(с.686-690).

Аўтарскаму калектыву ўдалося стварыць каштоўнае навуковае выданне, якое вельмі патрэбна сення не толькі навукоўцам, выкладчыкам ВНУ, магістрам, аспірантам, студэнтам, але і шырокаму колу грамадскасці, усім, хто цікавіцца гісторыяй нашай Бацькаўшчыны.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе, доктар гістарычных навук, прафесар;
Валянцін Генрыхавіч Мазец, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



Created in Master PDF Editor - Demo Version